«Хай згадка згадку кліча, цягне...»

Па архіўных слядах «Вянка»

Беларусь святкуе 125-гадовы юбілей свайго выдатнага сына — паэта Максіма Багдановіча, які ўзбагаціў нашу літаратуру творамі выключнага ўзроўню, доказна сцвердзіўшы вобразна-выяўленчыя магчымасці роднай мовы і яе правы заняць пачэснае месца сярод самых паэтычных моў свету. З усёй творчай спадчыны Максіма Багдановіча знакавы яго адзіны прыжыццёвы зборнік «Вянок», праз які паэт з юначай шчырасцю прызнаецца ў вялікай любові Радзіме і свайму народу. *«Я не самотны, я кнігу маю»* — апошнія радкі паэта. Горка думаць, што «ў краіне светлай» ён памірaў у адзіноце, і суцешна, што да апошніх хвілін жыцця з ім была яго паэзія і яго кніга — яго працяг і яго несмяротнасць.

Ці мог прадбачыць паэт лёс сваёй кнігі? Ці ўяўляўся яму чытач далёкай будучыні, які і праз стагоддзе, зачараваны хараством паэтычных радкоў, будзе імкнуцца разгадаць таямніцу яго высокіх пачуццяў?.. Сёння ў кожнага, хто цікавіцца асабістым і творчым лёсам М. Багдановіча, нават самая маленькая згадка пра яго і пра яго творы выклікае вялікае захапленне і змушае да новых пошукаў. І ёсць яшчэ дакументальныя крыніцы, якія варта даследаваць, углядвацца-ўчытвацца ў кожны іх радок, у кожнае слова. Такой крыніцай з'яўляецца фонд Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні, што захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Даследуючы гісторыю беларускай выдавецкай справы па матэрыялах згаданага фонду, выклікаў увагу вельмі цікавы дакумент пад назвай *«Opis kniharni Bielaruskaho wyd. T-wa u Wilni, zdadzienych Apiekuńčaj Kamisii 23.04.1917 h.»*, які і стаў нагодай звярнуцца да гісторыі Багдановічавага «Вянка».

Вопіс кнігарні налічвае каля 240 назваў беларускіх выданняў і ўказвае на колькасць асобнікаў кожнага выдання, кошт аднаго выдання і агульную суму. Сярод многіх прысутнічае тут і зборнік Максіма Багдановіча «Вянок». Першы запіс пра зборнік у названым вопісе зроблены на старонцы 2 кірыліцай, які ўказвае на 1355 асобнікаў па пяцьдзясят капеек кожны — на агульную суму 677 рублёў 50 капеек. Наступны запіс знаходзім на старонцы 4 лацінкай: *«46 — Wianok — 50 — 18.00»*. Тут відавочная памылка. Калі суму лічыць правільнай, то асобнікаў павінна быць 36, а не 46. На гэтай жа старонцы яшчэ адзін запіс лацінкай: *«30 — Wianok — 50 — 15.00»*. Адразу ж узнікае пытанне: чаму два названыя запісы зробленыя лацінкай? Вядома, што беларускія выданні таго часу друкаваліся як лацінкай, так і кірыліцай, альбо рабіліся паралельныя наклады: адно выданне ў двух шрыфтах. Гэтую з'яву адлюстроўвае і вопіс. «Вянок», як вядома, выйшаў кірылічным шрыфтам. Чаму тады складальнік вопісу зрабіў два запісы лацінкай, калі прытрымліваўся фіксацыі назваў кніг адпаведна іх шрыфту? Адказ можа быць простым: гэтая адпаведнасць не заўсёды захоўвалася, бо аўтар раз-пораз «збіваўся» на больш зручную для яго лацінку. Тым не менш не трэба адпрэчваць думку, што магла быць невялікая частка накладу «Вянка» і лацінскім шрыфтам. Ці так ужо дэталёва даследавана ў нашым літаратуразнаўстве гісторыя выдання таго часу?



1909 г.

Годам выхаду «Вянка» ў свет пазначаны 1913-ы. Наклад выдання, відавочна, быў тыповым для таго часу — не менш за дзве тысячы асобнікаў. Гэта ж ускосна пацвярджаюць і лічбы вопісу: у адпаведнасці з ім агульная колькасць нерэалізаваных кніг «Вянка» ў 1917 годзе складала 1421 асобнік. Чаму так неэфектыўна рэалізоўваўся наклад зборніка, якія перашкоды сталі на яго шляху да шырокага чытача? Адказ на гэтае пытанне дае вывучэнне архіўнага фонду Беларускага музея імя А. Луцкевіча, а таксама газеты «Наша ніва» ад канца 1913 года да апошняга яе нумара 7 жніўня 1915 года. На жаль, дакументаў захавалася не так многа, але і гэтая невялікая колькасць дапамагае раскрыць некаторыя дэталі арганізацыі працы па выданні.

Ва ўспамінах Вацлава Ластоўскага, змешчаных у «Выбраных творах» (Мінск, 1997 год), чытаем, што *«за некалькі месяцаў пасля выезду з Вільні М. Багдановіч надаслаў у рэдакцыю "Нашай Нівы" рукапіс, у якім былі сабраны яго вершы як некаторыя з раней друкаваных у "Нашай Ніве", так і нанова ім напісаныя, пад загалоўкам "Кніжка выбраных вершаў" з просьбай выпусціць асобнай кніжачкай. Рукапіс гэты пралежаў у рэдакцыі больш паўгода, бо не было грошы, каб надрукаваць яго. І толькі ў 1913 годзе былі дабыты грошы на друкаванне рукапісу»*.

Сапраўды, адсутнасць фінансавання іграла выключную ролю ў лёсе многіх выданняў. Але ў дадзеным выпадку справа была не толькі ў гэтым. Калі звярнуцца да некаторых фактаў з гісторыі выдавецкай справы таго часу, то становіцца відавочным, што кніга М. Багдановіча не магла выйсці ў Вільні раней за другую палову 1913 года.

Паводле звестак В. Ластоўскага, паэт даслаў свой рукапіс пад канец 1912-га ці ў самым пачатку 1913 года. Менавіта ў гэты перыяд у Вільні пачало рыхтавацца прадпрыемства, якое ў гісторыю нашай культуры ўвайшло пад назвай «Беларускае выдавецкае таварыства» (БВТ), а рэдакцыя газеты «Наша Ніва», у сваю чаргу, усю выдавецкую справу перадала новастворанаму таварыству. 1 ліпеня 1913 года *«дваранін Вацлаў Леанардавіч Іваноўскі, дваранін Барыс Лявонцьевіч Даніловіч, дваранін Іван Іванавіч Луцкевіч, дваранін Канстанцін Баляслававіч Шпакоўскі і дваранін Антон Іванавіч Луцкевіч заключылі [...] дамову таварыства на даверы»* (БДАМЛМ. Фонд 3. Вопіс 1. Адз. зах. 33. Арк. 7). 2 жніўня 1913 года В. Ластоўскі паведамляў, што *«выдавецтва "Н.Н." перадало Беларускаму выдавецкаму таварыству ў Вільні выдавецтва сваё "Беларускі календар", які існуе ўжо чацвёрты год, разам з фірмай, непрададзенымі экзэмплярамі кніг, падрыхтаванымі для друку матэрыяламі і правам на атрыманне грошай за прынятыя да друку ў календары аб'явы і заказы на каляндар»* (БДАМЛМ. Фонд 3. Вопіс 1. Адз. зах. 33. Арк. 22).



Так, усе выдавецкія праекты, распачатыя ў «Нашай Ніве», перахадзілі да БВТ. З гэтага часу і была актывізавана праца па падрыхтоўцы да выдання такіх вядомых зборнікаў, як «Курганная кветка» К. Буйло, «Родныя з'явы» Якуба Коласа, «Васількі» Ядвігіна Ш. і інш. Сярод іх сваё годнае месца заняў і «Вянок» М. Багдановіча. Хоць і пазначаны годам выхаду на зборніку 1913-ты, трэба думаць, што выхад яго ўсё ж адбыўся ў пачатку 1914-га. Захаваўся дакумент — *«Выпіскі з касавай кнігі грашовых рахункаў Кнігарні Бел. Выд. Таварыства гатоўкай»*, які сведчыць, што на працягу студзеня 1914 года яшчэ рабіліся аплаты па выданні (БДАМЛМ. Фонд 3. Вопіс 1. Адз. зах. 33. Арк. 32). У чарнавіку справаздачы захаваўся запіс аб значных сумах «гатоўкай», якія выдаваліся В. Іваноўскаму пад распіску. Усе гэтыя дакументы складаліся загадчыкам кнігарні БВТ В. Ластоўскім.

Мяркую, што названыя касавыя запісы можна растлумачыць наступным чынам. Кнігарня БВТ, якая мела ад продажу кніг і канцылярскіх тавараў наяўныя грошы («гатоўку»), выдавала сумы пад распіску, за кошт якіх рабіліся разлікі за пэўныя выдавецкія заказы, у тым ліку на атрыманне тыражоў з друкарань. Разлікі з друкарнямі праз адсутнасць грошай часам зацягваліся, што стрымлівала своечасовы выпуск ці нават выдачу заказчыку гатовых накладаў. Праца друкарань вельмі моцна залежала ад заказчыкаў. Незадоўга да арганізацыі БВТ Іван Луцкевіч пісаў брату Антону ў Пецярбург: *«Дарагі Антоне! У нас вельмі гора з грашамі, так, што, калі 6-га або 7-га зранку Кухце 200 рублёў не заплацім, то яму кабель электрычны здымуць»* (БДАМЛМ. Фонд 3. Вопіс 1. Адз. зах. 261. Арк. 21).

Магчыма, што і зборнік М. Багдановіча трапіў у сітуацыю, калі выдаўцам не хапіла грошай, каб адразу цалкам разлічыцца з друкарняй і забрацъ наклад агулам. Да гэтай думкі прыводзіць адно назіранне. 21 лютага 1914 года Антон Луцкевіч надрукаваў на старонках «Нашай нівы» рэцэнзію на зборнік «Вянок» пад назвай «Пясняр чыстай красы». Праз некалькі нумароў, 7 сакавіка 1914 года, «Наша ніва» змясціла інфармацыю пра «Вянок» у раздзеле «Агляд кніг». З першага нумара (4 студзеня) 1914 года «Наша ніва» распачынае друкаваць абвесткі «Беларускай кнігарні»: спачатку пра тыя выданні, якія браліся на продаж ад розных выдавецтваў, а пасля і пра тыя, якія пачалі паступаць з БВТ. Так было аб'яўлена аб паступленні на продаж кніг «Васількі» Ядвігіна Ш., «Сыгнал» У. Гаршына, «Родныя з'явы» Т. Гушчы (Якуба Коласа), «Курганная кветка» К. Буйло, «Рунь» М. Гарэцкага і інш. Але пра тое, што ў «Беларускую кнігарню» паступіў на продаж зборнік М. Багдановіча, аб'ява ў «Нашай ніве» ў 1914 годзе так і не з'явілася. У 1915 годзе газета такіх аб'яў ужо, можна сказаць, не друкавала, за выключэннем №№ 19-20, дзе было паведамлена пра выхад кніжкі С. Бірылы «Стражнік».

І ўсё ж «Вянок», як відаць са згаданага ў самым пачатку «Опісу» 1917 года, у кнігарню паступіў. Але гэта магло адбыцца тады, калі ўжо ўся грамадскасць была паглынутая падзеямі Першай сусветнай вайны. Неўзабаве БВТ, а ў жніўні 1915 года — і газета «Наша ніва», спынілі сваю дзейнасць. Іх арганізатары і кіраўнікі яшчэ ў маі 1915 года стварылі «Беларускае таварыства памачы пацярпеўшым ад вайны», «маршалкам камітэту» якога стаў В. Іваноўскі, а яго намеснікамі А. Луцкевіч і В. Ластоўскі. Уся маёмасць БВТ, у тым ліку кнігарня і кніжны склад, зразумела, заставаліся пад іх апекай. У 1917 годзе, калі загадчык кнігарні В. Ластоўскі ўжо цалкам аддаўся палітычнай працы, узнікла неабходнасць стварыць апякунчую камісію і прыняць ад В. Латоўскага ўсе выданні, якія былі ў «Беларускай кнігарні».

БВТ аднавіла сваю дзейнасць толькі ў 1920 годзе. У чэрвені 1921 года С. Рак-Міхайлоўскі зрабіў інвентарныя вопісы маёмасці яго кніжнага складу і «Беларускай кнігарні». У першым вопісе пад № 9 выяўлены запіс: «Вянок» М. Багдановіча 190 × 25 = 4.750»; у другім — пад № 10: «Вянок» Багдановіча 25 × 25 = 650» (БДАМЛМ. Фонд 3. Вопіс 1. Адз. зах. 33. Арк. 48, 50). Як бачым, з 1421 асобніка, зафіксаванага ў вопісе 1917 года, у чэрвені 1921 года засталося толькі 215.

Паўстае пытанне: якім чынам была рэалізавана ў гэты неспрыяльны для грамадства час такая значная колькасць кніг, і не толькі зборніка «Вянок», а і многіх іншых выданняў, пазначаных у вопісе 1917 года? Можна меркаваць, што нейкая частка была аддадзена на рэалізацыю ў іншыя кнігарні. Але, як аднойчы ў прыватнай размове выказаў думку гісторык А. Сідарэвіч, значная частка кніг, якія знаходзіліся ў Вільні, у тым ліку «Вянок», пайшла ў часы Першай сусветнай вайны і Сярэдняй Літвы на патрэбы беларускіх навучальных і культурна-асветных устаноў. Толькі да канца 1918 года было адчынена 153 беларускія школы, з 1919 года дзейнічала Віленская беларуская гімназія, а ў першы прызыў існавання Сярэдняй Літвы, калі Б. Тарашкевіч, В. Іваноўскі, А. Луцкевіч і некаторыя іншыя дзеячы прынялі рашэнне выкарыстаць спрыяльныя для развіцця беларускай адукацыі і асветы палітычныя абставіны, ужо вясной 1921 года працавала 186 беларускіх школ, Барунская настаўніцкая семінарыя, настаўніцкія курсы, створана Таварыства беларускай школы.

Цешыць думка, што такая значная колькасць Багдановічавага «Вянка» не стала ахвярай полымя вайны, а была надзейнай падтрымкай у працы настаўніцтва беларускай нацыянальнай школы, выхаванцелем патрыятычных пачуццяў і эстэтычных густаў маладога пакалення беларусаў.

Ганна ЗАПАРТЫКА